# Чатыры мільёны кніг

У фондах Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна цяпер налічваецца амаль чатыры мільёны кніг. Штодзённа чытачам выдаецца каля шасці тысяч кніг. Бібліятэка мае дзесяць чытальных залаў на тысячу месц. Гэтымі днямі яе фонды папоўніліся новымі кнігамі, выдадзенымі ў Мінску, Маскве, Кіеве і іншых гарадах краіны.

У бібліятэцы пачалася падрыхтоўка да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна, чыё імя ўжо шмат гадоў носіць гэта буйнейшая не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе дзяржаўная бібліятэка.